Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ГАЛОЎНАЕ КІРАЎНІЦТВА
АДЗІНАЙ ГІДРАМЕТЭАРАЛАГІЧНАЙ СЛУЖБЫ
пры НКЗ БССР

ДЭКАДНЫ БЮЛЕТЭНЬ

Адрас рэдакцыі: Менск, р. Карла Маркса і Чырвонаармейскай, 48, Галоўнае Кіраўніцтва АГМС БССР.

№ 13 (147) | 1—10 мая | 1934 г.

ЗМЕСТ

Агляд надвор'я за дэкаду з 1-га па 10-га мая 1934 года

Надвор'е, якое трымалася на тэрыторыі БССР з 1-га па 10-га мая, было надзвычайна аднастайным. На працягу ўсёй дэкады наглядалася сухое, яснае і гарачае надвор'е з вялікім сутачным ходам тэмпературы, з вельмі вялікаю вільготнасцю паветра, якая ў дзень дасягала да 25%.

Такое жаркае, сухое і ўстойлівае надвор'е ў БССР тлумачыцца тым, што на працягу ўсёй дэкады, на тэрыторыі Савецкага Саюза і большай часці Зах. Еўропы, трымаецца вобласць высокага ціску ў масах кантынентальна-палярнага паветра.

Цыклональная дзейнасць адбываецца на крайнім захадзе Еўропы і праходзіць праз Англію па заходняму пабярэжжу Скандынавіі на Шпіцберген і Новую Зямлю.

У перщы дзень дэкады тэрыторыя БССР знаходзіцца пад уплывам сухіх і цёплых мас кантынентальнага палярнага паветра. Максімальныя тэмпературы, ў гэты дзень, дасягалі да +27 +28 градусаў.

Табліца вынікаў метэаралагічных

Кліматычны раён	№№ па карце	Назва станцый	Тэмпература паветра															
			1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	—	Сярэдняя	Нармальн.	Максімальная	Мінімальная	Число, калі нагляд. мінімум
I. Паўночны (вазёрны)	2	Дрыса	18	17	19	19	19	19	18	18	19	20	—	19	—	27	7	8
	3	П лацк	17	17	20	20	20	19	18	19	20	20	—	19	10	27	7	8
	—	Вялікія-Лукі	16	17	19	17	18	18	18	18	18	18	—	18	—	26	5	7
	68	Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	84	Сураж	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	7	Нова-Каралёва	16	18	20	20	20	20	18	19	20	20	—	19	9	26	9	8
II. Пераходны (вадападзельны)	8	Лепель	17	20	21	21	20	20	18	19	21	20	—	20	—	28	10	8
	75	Плешчаніцы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—		—
	70	Бобр	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—		—
	13	Барысаў	18	19	21	22	20	20	19	19	21	21	—	20	11	29	9	8
	16	Менск	19	18	21	21	20	21	20	19	19	20	—	20	11	28	8	8
	93	Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	23	Мар'іна-Горка	19	20	20	21	19	19	19	19	19	20	—	19	11	28	9	8
	25	Асіпавічы	19	20	22	21	21	20	19	20	21	22	—	20	11	31	9	8
	10	Орша	17	18	20	20	19	20	18	19	19	21	—	19	10	27	9	8
	19	Горкі	15	17	20	20	18	18	18	19	19	20	—	18	10	26	9	2
III. Цэнтральны (раўнінны)	89	Клічаў	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	28	Слуцак	18	19	21	20	20	20	20	—	—	—	—	19	—	28	10	9
	30	Мар.-Сосны	20	20	22	20	19	19	18	19	19	20	—	20	12	29	5	8
	21	Магілеў	17	18	21	21	[illegible]	20	18	18	20	21	—	19	11	29	10	2
	73	Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	27	Чэрыкаў	17	19	22	21	20	19	18	19	20	20	—	19	11	28	9	7
	191	Касцюковічы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—		—
	31	Турск	19	19	21	21	20	19	18	19	20	20	—	20	11	28	10	7
	32	Жлобін	19	20	21	22	21	20	20	20	21	21	—	20	11	28	12	8
IV. Паўднёвы (нізінны)	33	Жыткавічы	19	21	22	21	19	21	20	19	20	21	—	20	12	30	7	8
	37	Калінкавічы	20	21	22	20	20	21	20	19	21	21	—	21	12	30	7	8
	39	Лельчыцы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—		—
	85	Чачэрск	[illegible]	[illegible]	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—		—
	83	Барба	—	[illegible]	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—		—
	38	Гомель	18	20	23	21	21	21	18	20	21	21	—	20	12	29	10	7
	35	Васілевічы	19	21	21	20	20	21	19	18	20	20	—	19	12	28	7	8
	40	Людвінава	19	22	22	21	20	21	20	19	20	20	—	20	12	29	10	9

назіранняў за 1—10 мая 1934 г.

Адносная вільготн. паветра ча 13 г. у %%	Тэмпература паверхні глебы			Ападкі ў мм												Мэтэаралагічная з'ява (у дужках адзначаны числы)
	Максімал.	Мінімальн.	Чысло, калі нагляд. мінімум	1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	—	Сума	
46	—	4	7	..	0.4	22.0	..	..	..	..	..	..	..	—	22.4	граза (2, 3)
44	—	—	—	..	1.0	2.0	..	..	..	..	..	..	..	—	3.0	граза (2)
47	35	8	7	..	3.0	..	..	..	..	..	..	..	..	—	3.0	граза (3, 4)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
40	41	4	8	..	0.2	2.0	..	..	..	..	..	..	..	—	2.2	—
39	—	—	—	..	0.5	1.0	..	..	..	..	..	..	..	—	1.5	граза (10)
—	—	—	—	0.3	..	..	..	1.0	..	..	..	..	..	—	1.3	граза (5)
—	—	—	—	0.1	1.0	9.0	..	..	..	0.1	..	..	..	—	10.2	граза (2)
41	—	—	—	0.1	..	..	..	..	..	..	..	..	..	—	0.1	граза (3, 5)
35	37	5	2	1.0	6.0	..	..	..	..	..	..	..	..	—	7.0	град (2)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
36	34	8	8	..	..	..	..	0.1	..	..	..	..	..	—	0.1	граза (3)
33	—	4	2	..	..	..	..	..	..	..	..	..	..	—	0.0	—
47	—	8	8	..	11.0	0.1	..	..	..	..	..	..	..	—	11.1	граза (2, 3)
42	39	7	2	..	..	1.0	..	..	..	..	..	..	..	—	1.0	граза (2 ,3)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
49	—	8	9	7.0	0.1	..	..	..	..	..	..	..	..	—	7.1	лівень (1), граза (2)
28	—	2	8	5.0	..	3.0	0.1	..	..	..	..	..	..	—	8.1	—
46	—	—	—	1.0	4.0	..	0.5	..	.	..	..	..	..	—	5 5	граза (2, 3)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
36	—	—	—	..	0.1	.	..	0.1	..	..	..	..	..	—	0.2	—
—	—	—	—	..	..	..	..	..	..	..	..	..	..	—	0.0	—
38	39	8	7	.	0.2	9.0	..	0.2	..	..	..	..	..	—	9.4	—
35	—	—	—	0.4	..	0.1	..	..	..	0.1	..	..	..	—	4.2	—
33	—	—	—	3.0	..	..	..	..	..	..	..	..	..	—	3.0	граза (2)
32	—	6	8	..	..	..	..	..	..	..	..	0.1	..	—	0.1	сільны вецер (5, 6)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	..	0.3	..	..	..	..	..	..	..	..	—	0.3	граза (2)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
32	—	2	9	..	0.1	..	..	..	..	..	..	..	..	—	0.1	—
29	—	5	8	..	..	..	..	..	..	..	..	..	..	—	0.0	—
31	39	8	7	..	0.2	..	..	..	..	..	..	..	..	—	0.2	—

Табліца вынікаў метэаралаг. назіранняў за 1—10 мая 1934 г.

Кліматычны раён	№№ па карце	Назва станцый	Вецер: Пераважаючы: Напрамак	Вецер: Пераважаючы: Хуткасць	Вецер: З максім. хуткасцю: Напрамак	Вецер: З максім. хуткасцю: Хуткасць	Інсаляцыя у %%	Сярэдняя воблачнасць у 10-балавай сістэме: Агульная	Сярэдняя воблачнасць у 10-балавай сістэме: Ніжняя	Сярэдні стан паверхнёвага пласта глебы (на глыб. 10—15 см)
I. Паўночны (вазёрны)	2	Дрыса	SE	2	SE	7	—	3	3	вільготная
	3	Полацк	E	2	E	4	—	6	3	"
	—	Вялікія Лукі	E	2	NW	10	—	5	2	"
	68	Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—
	84	Сураж	—	—	—	—	—	—	—	—
	7	Нова-Каралёва	E	4	SE	10	65	3	1	сухая
II. Пераходны (вадападзельны)	8	Лепель	SE	4	S	10	—	3	2	сухая
	75	Плешчаніцы	—	—	—	—	—	—	—	—
	70	Бобр	—	—	—	—	—	—	—	—
	13	Барысаў	SE	2	SE	5	—	3	2	сухая
	16	Менск	SE	2	SE	3	—	3	2	"
	93	Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	—
	23	Мар'іна-Горка	E	4	N	7	—	3	1	сухая
	25	Асіпавічы	E	2	SE	7	—	3	1	вільготная
	10	Орша	SE	2	S	10	—	6	1	"
	19	Горкі	SE	4	W	10	—	2	2	сухая
III. Цэнтральны (раўнінны)	89	Клічаў	—	—	—	—	—	—	—	—
	28	Слуцак	SE	4	W	14	—	3	2	—
	30	Мар'іна-Сосны	E	2	E	4	—	3	1	вільготная
	21	Магілеў	NE	4	SE	6	—	5	—	сухая
	73	Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—
	27	Чэрыкаў	S	4	W	7	—	3	3	сухая
	191	Касцюковічы	—	—	—	—	—	—	—	"
	31	Турск	E	4	SE	10	—	3	3	"
	32	Жлобін	SE	2	SE	7	—	3	1	"
IV. Паўднёвы (нізінны)	33	Жыткавічы	E	4	SE	10	—	5	2	сухая
	37	Калінкавічы	E	4	E	14	—	2	1	вільготная
	39	Лельчыцы	—	—	—	—	—	—	—	—
	85	Чачэрск	—	—	—	—	—	—	—	сухая
	83	Барба	—	—	—	—	—	—	—	—
	38	Гомель	SE	4	SE	10	—	2	1	вільготная
	35	Васілевічы	SE	4	SE	7	77	2	2	сухая
	40	Людзінава	SW	4	SE	10	—	3	3	"

На змену гэтай масе, 2-га мая з паўднёвага—захаду ўваходзяць яшчэ больш цёплыя масы прагрэтага кантынентальна-палярнага паветра, у выніку чаго тэмпература на поўдні краіны даходзіла да +31 градуса. Аклюзія па тыпу цёплага фронту, якая раздзяляла гэтыя масы, прайшла па тэрыторыі БССР і дала ў некаторых мясцах праходзячыя ападкі (1-га, 2-га і 3-га мая).

Гэтае цёплае кантынентальна-палярнае паветра ўтрымліваецца на тэрыторыі БССР усе астатнія дні да канца дэкады. На працягу ўсяго гэтага часу мы мелі сухое і пераважна яснае, без ападкаў, надвор'е.

Наогул кажучы, гэтая дэкада праходзіць без рэзкіх змен надвор'я і, на працягу ўсёй дэкады, на тэрыторыі БССР, трымаецца кантынентальна-палярнае паветра.

Харлап.

Метэаралагічная характарыстыка за 1—10 мая 1934 года

На працягу ўсей гэтай дэкады трымаліся вельмі ўстойлівыя высокія тэмпературы. Сярэднія сутачныя т-ры, у большасці хісталіся каля 19-20°. Сярэднія дэкадныя т-ры таксама былі роўны пераважна 19-20°. Яны перавышалі нармальныя т-ры для гэтай дэкады на 8-9°.

Максімальныя т-ры хісталіся ад 26 да 31°, мінімальныя—ад 7 да 12°.

Ападкі выпадалі вельмі нераўнамерна. У першыя 3 дні месцамі выпалі значныя ападкі з грозамі і градам. Асабліва значныя ападкі выпалі ў такіх пунктах: у Дрысе—22 мм, у Бабры (Крупскага р-на) і Турску (Рагачоўскага р-на) па 9 мм. Навальніцы наглядаліся пераважна 2-га і 3-га. Бобр і Менск 2-га адзначылі выпадзенне града. З 4-га па 10-ае ападкаў амаль зусім не наглядалася.

Вятры пераважалі паўднёва-усходнія, слабыя і ўмераныя.

Воблачнасць, у большасці, складала 20—30% агульнага пакрыцця неба, а сонечнае ззянне складала 65—77% магчымага

Н. Малішэўская.

С-г. гідрамет. характарыстыка за 1—10/V-34 г.

Вельмі цёплае, без ападкаў, надвор'е першай дэкады мая спрыяла правядзенню с/г. працпасеваў зернавых і бульбы, і падрыхтоўкі глебы пад гародніну. Але ў большасці раёнаў рэспублікі, асабліва к канцу дэкады, стаў адчувацца недахоп вільгаці ў павярхловым пласту глебы. Маладыя расліны яравых, карнявая сыстэма якіх яшчэ не паспела дастаткова развіцца, пачалі адчуваць гэты недахоп. Азімыя адчуваюць сябе значна лепей.

У гэту дэкаду азімае жыта і пшаніца вышлі ў трубку, а метстанцыі Васілевічы (Рэчыцкі р-н) і Слуцк адзначаюць калашэнне. Ацэнка азімага жыта пераважна вышэй сярэдняга, а азімая пшаніца—сярэдняе. Яравыя і пшаніца у фазе трох лістоў, авёс—кушчэнне з 3-х лістоў, ячмень ў фазе 3-х лістоў—ацэнка сярэдняя і вышэй сярэдняга, а лён у фазе ўсходаў—

ацэнка здавальняючая. Горкі і Васілевічы адзначаюць усходы ранней бульбы. Таксама Горкі адзначаюць здавальняючыя ўсходы соі.

Сеяныя шматгадовыя травы развіваюцца здавальняюча.

Ўсходы вікі маюць сярэднюю ацэнку. Адзначаюцца ўсходы гарадніны.

Сады знаходзяцца ў поўным красаванні і бягучае надвор'е, на працягу дэкады, вельмі спрыяла данай фазе. Метстанцыя Мозыр адзначае з'яўленне садовых шкоднікаў непарнага шоўкапрада.

Сенажаці і выпасы знаходзяцца ў здавальняючым становішчы.

Аграметкор П'янусаў (Чавускі р-н) паведамляе, што 5-га мая прашоўшым градам пашкоджаны часткова яравыя пасевы.

В. Стэфановіч

Характар веснавога паўнаводдзя ў 1934 годзе па галоўных рэках БССР і вынікі прагноза.

Галоўную ролю ў фарміраванні вышыні паўнаводдзя адыгрываюць метэаралагічныя фактары—зімовыя ападкі і тэмпература, вышыня і шчыльнасць снегавага насціла перад пачаткам веснавага растайвання. Акрамя гэтага цэлы шэраг другіх фізіка-геаграфічных фактараў, таксама прымаюць значны ўдзел у фарміраванні вышыні паўнаводдзя—гэта ступень прамярзаемасці і насычанасці вільгацю глеб басейна—ў момант найбольш бурнага таяння снега, становішча запасаў грунтовай вады ў басейне, глебава-батанічная і арграфічная характарыстыка яго паверхні і, у вельмі значнай ступені,—характар веснавага надвор'я якое абумоўлівае інтэнсіўнасць і працягласць сходу снегавага насцілу сумесна з дадатковым выпадзеннем водных ападкаў у момант найбольш хуткага яго сходу.

Аналізуючы гэтыя моманты, з мэтай праракання вышыні веснавага павадка у бягучым годзе магчыма прыйсці да наступных вынікаў:

1) Вышыня снегавага насцілу ў басейнах галоўных рэк БССР была ніжэй нормы.

2) Сярэдняя шчыльнасць снегавага насціла паступова павялічваецца дзякуючы адлігам, якія ў значнай колькасці нагляdаліся ў другую палову зімы. Так, па дадзеным метстанцыі Новае-Каралёва, сярэдняя шчыльнасць снегавага насцілу дасягала ў першую дэкаду сакавіка 0,29, пры норме для гэтага часу 0,24.

3) Ступень прапітанасці глебы вадой з восені 1933 г. трэба лічыць вышэй нормы, што тлумачыцца вельмі „мокрым“ характарам прадзім'я 1933 года.

4) Прамярзанне глебы, у гэтым годзе, было ніжэй нармальнага.

5) Па дадзеных Інстытута Доўгатэрміновых праракання Цэнтральнага Бюро Надвор'я, пры складанні прагноза чакалась, што тэрыторыя БССР будзе знаходзіцца ў вобласці слаба вызначаных мінімумаў і, такім чынам, з'явіцца раёнам меш хуткага таяння.

Гідралагічны сэктар Бюро Надвор'я БССР, улічваючы падрабязныя даныя па кожнаму басейну, склаў 15/III-34г. прагноз чакаемай вышыні веснавага паводку на галоўных, больш буйных, рэках БССР, карыстаючысь эмпірычнай формулай праф. Б. Н. Лебедзева, а з другога—карэляцыйнымі раўнаннямі сувязі паміж гідраметэаралагічнымі фактарамі ў басейне, і вышынёй веснавага павадку для рэк Бярэзіны, Сожа і Зах-Дзвіны, знойдзенымі непасрэдна гідрасектарам Бюро Надвор'я БССР.

Гэты прагноз прадугледжваў наступнае:

1. Ускрыццё рэк:

Ускрыццё ракі Прыпяці—ў пачатку трэцяй дэкады сакавіка.
„ „ Пцічы—ў пачатку трэцяй дэкады сакавіка.
„ „ Бярэзіны—ў сярэдзіне трэцяй дэкады сакавіка.
„ „ Сожа—ў канцы трэцяй дэкады сакавіка.
„ „ Дняпро на вучастку Орша-Рагачоў— ў першай палове трэцяй дэкады сакавіка.
„ „ Дняпро на вучастке Жлобін-Лоеў—у канцы трэцяй дэкады сакавіка.
„ „ Свіслачы—ў канцы другой дэкады сакавіка.
„ „ Зах. Дзвіны—ў канцы сакавіка—першай дэкадзе красавіка.

II. Час прахода грэбня паўнаводдзя.

На раке Прыпяці—ў першай дэкадзе красавіка.
„ „ Пцічы—ў другой палове трэцяй дэкады сакавіка.
На раке Бярэзіне—ў канцы трэцяй дэкады сакавіка.
„ „ Сожу—ў канцы трэцяй дэкады сакавіка і пачатку першай дэкады красавіка.
„ „ Дняпро—ў канцы трэцяй дэкады сакавіка і ў першай палове першай дэкады красавіка.
„ „ Свіслачы каля 18-19 сакавіка.
„ „ Зах. Дзвіны—ў канцы трэцяй дэкады сакавіка і першай дэкадзе красавіка.

Акрамя гэтага былі прадсказаны вышыні максімумаў па 24 пунктам.

У сучасны момант магчыма падвесці вынікі апраўдваемасці гэтага прагноза па 15 пунктам:

Аналіз гэтай табліцы дае наступныя вынікі:

1) Вышыня веснавага павадку амаль на ўсіх рэках была некалькі вышэй нормы.

2) У бягучым годзе мела месца ранняе ўскрыццё ўсіх рэк БССР.

3) Добрымі трэба лічыць прагнозы тэрмінаў ускрыцця і часу прахода грэбня паўнаводдзя па ўсім рэкам.

4) Адносна якасці прагакання вышыні веснавога павадка, неабходна канстатаваць наступнае:

а) Добрымі прараканнямі вышыні веснавай павадкі былі: для ракі Дняпра ля Оршы, Рагачова, Жлобіна і Лоева, для ракі Сожа, для ракі Бярэзіны ля Бярэзіно і Бабруйска для р. Зах. Дзвіны ля Віцебска і для Свіслачы ля Менска.

б) Здавальняючым прагноз магчыма лічыць для ракі Дняпро ля Магілёва, для ракі Зах. Дзвіны ля Веліжа і ля Улы і для ракі Прыпяці ля Мозыра.

Рака	Пост	Дата ўскрыцця	Дата грэбня паўнаводдзя	Вышыня гребня паводка над нулём графіка ў см.			Адхілене ад нормы	Памылкі па прагнозу ў см.	
				У сапраўднасці	Па прагнозу	Норма		Абсалютн. велічыня	У % к ампл. веснавых максімумаў
Днепр	Орша	19/III	7/IV	553	570	593	— 40	— 17	2,56
"	Магілеў	21/III	23/III	651	580	587	+ 64	+ 71	21,38
"	Рагачоў	22/III	26/III	217	196	202	+ 15	+ 21	10,88
"	Жлобін	22/III	27/III	322	305	307	+ 15	+ 17	9,50
"	Лоеў	23/III	30/III	569	490	495	+ 74	+ 79	13,50
Сож	Прапойск	23/III	23/III	374	355	359	+ 15	+ 19	5,86
"	Гомель	23/III	27/III	507	445	465	+ 42	+ 62	11,90
Бярэзіна	Барысаў	18/III	25/III	396	340	332	+ 64	+ 56	36,13
"	Бярэзіно	21/III	23/III	277	270	228	+ 49	+ 7	2,92
"	Бабруйск	22/III	25/III	334	310	271	+ 63	+ 24	9,16
Зах. Дзвіна	Веліж	25/III	28/III	469	560	521	— 52	— 91	16,25
"	Віцебск	23/III	29/III	743	705	583	+ 60	+ 38	4,66
"	У л а	20/III	24/III	960	740	683	+277	+220	23,63
Прыпяць	Мазыр	18/III	28/III	446	320	303	+143	+126	26,58
Свіслач	Менск	16/III	20/III	410	390	355	+ 55	+ 20	5,81

в) Нездавальняючым прагноз з'віўся для ракі Бярэзіны ля Барысава.

Наогул кажучы добрых прагнозаў было 66,7% ад агулнай колькасці прагнозаў, здавальняючых—26,7%, нездавальняючых—6,6%

Увесь матар'ял да гэтага артыкула атрыман на падставе тэлеграфных звестак.

А. Свадкоўскі.

Падрыхтоўка кадраў

Адным з асноўных пытанняў ГК АГМС БССР у 1934 годзе з'яўляецца пытанне падрыхтоўкі кадраў для метэаралагічнай сеткі. Без добра падрыхтаваных кадраў наглядацеляў метэаралагічная сетка, як асноўная частка сыстэмы ГК АГМС, не можа справіцца з актуальнейшымі задачамі, якія ставяцца з боку розных галін народнай гаспадаркі (с.-г., транспарт, авіацыя і абарона краіны і друг.). Праверка работы назіральнікаў гідраметэаралагічных станцый іх соцыяльнага складу і тэхнічных ведаў паказала, што існаваўшы склад назіральнікаў далёка нездавальняючы. Гэты склад быў укамплектаваны ў вялікай сваёй частцы чуждымі і тэхнічна непісменнымі людзмі—адна частка з іх не хацела, а другая не ўмела выконваць сваі абавязкі.

Падрыхтоўка і ўкамплектаванне штатаў назіральнікаў на метэаралагічныя станцыі ў асноўным праводзіцца ГК АГМС праз спецыяльна арганізуемыя падрыхтоўчыя курсы.

У гэтым годзе, з 1-га чэрвеня арганізоўваюцца 6-цімесячныя курсы, якія разлічаны на 30 асоб. Загадчыкам курсаў прызначан Нач-к Адзела тав. Бугаеў, які ўжо правёў наступную работу: 1) падабраў склад выкладчыкаў; 2) разгледжаны і зацверджаны праграмы па многім дысцыплінам і камісія прыступіла да разгляду заяў аб прыёме на курсы.

Праграма курсаў састаіць з наступных 18 дысцыплін.

1. Грамадазнаўства—90 гадзін.
2. Задачы ЕГМС і яе структура—4 гадзіны
3. Методыка скарочаных матэматычных вылічэнняў—60 гадзін.
4. Кароткі курс фізікі—80 гадзін.
5. Агульны курс метэаралогіі і аэралогіі—90 гадзін.
6. Кароткі курс сінаптычнай метэаралогіі—30 гадзін.
7. Месцовыя прыметы—20 гадзін.
8. Міжнародны атлас воблакаў—30 гадзін.
9. Міжнародны код—24 гадзін.
10. Спецыяльны код—8 гадзін.
11. Аэраметстанцыя яе апаратура і ўход за апаратурай—70 гадзін.
12. Методыка інструментальных і неінструментальных назіранняў і іх фіксацыя—70 гадзін.
13. Методыка апрацоўкі назіранняў—80 гадзін.
14. Гідралогія (кароткі курс)—16 гадзін.
15. Служба ўраджая—50 гадзін.
16. Дарожная сіноптыка—12 гадзін.
17. Абслугоўванне паветранага флота—10.
18. Практыка па метстанцы—216 гадзін.

Усяго: . . . 900 гадзін.

Курсанты будуць забяспечаны інтэрнатам, абедамі і снеданнямі, стыпендыяй па паспяховасці ў сярэднім 60 р. у м-ц.

На курсы прымаюцца лепшыя ўдарнікі.

Асобы, якія паспяхова скончаць курсы могуць быць назначаны загадчыкамі метстанцый, аклад якім ўстанаўліваецца ў залежнасці ад аб'ёма работы станцыі і вытворчага стажу ад 150 руб. да 225 руб., а собам з вышэйшай адукацыяй аплата выгвараецца па стаўкам спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй.

ГК. АГМС. БССР.

Адказны рэдактар П. Мамаеў.

Члены рэдкалегіі: Ф. Рабаконь, А. Кайгарадаў, Б. Лісіцкі, І. Калько, І. Рачыцкі.



Друкарня БелАН. Зак. № 180. Гарліт № 2991. Тыраж 600

